# У госці да Дзеда Мароза

Сёння, 24 снежня, споўнілася роўна 6 гадоў, як у сядзібе Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы пабывалі першыя наведвальнікі. Паўмільёна жыхароў з 92 краін свету прайшліся яе казачнымі сцяжынамі.

— Часцей за ўсё — гэта нашы землякі-беларусы і блізкія суседзі з Расіі, Украіны. Няма такога дня, каб тут нехта не быў, — тлумачыць мне гаспадар сядзібы Белавежскі Дзед Мароз. — Пабывалі ў мяне людзі з усіх рэгіёнаў, нават самых-самых аддаленых.

**—А па ўзросце?**

— 65 працэнтаў — дарослыя. Дзяцей крыху менш.

У атачэнii шматвяковога лесу, у яго некранутай аўры спасцігаеш простую філасофію жыцця. Чалавек сярод прыроды — прыгожы. І думкамі, і справамі. Пушча — лес насамрэч першабытны, некалі ён распасціраўся ад Балтыйскага мора да ракі Буг і ад Одэра да Дняпра. У доказ таго, што тут былі стаянкі першабытнага чалавека, за шклом у пушчанскім Музеі прыроды прадстаўленыя розныя рэчы — крэмніевыя наканечнікі стрэл, скрабкі, керамічны посуд. Тут гаспадарылі досыць моцныя ваяўнічыя плямёны, якія палявалі, лавілі рыбу. У больш блізкі да нас час, у канцы XIV стагоддзя вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Ягайла аб'явіў пушчу запаведнай і ўвогуле ўстанавіў тут забарону на паляванне. Першыя ж пісьмовыя згадкі пра Белавежскую пушчу датуюцца 983 годам. Глыбіні вякоў!

Можа таму, цяпер сярод пяцісотгадовых дрэў нават дарослыя пачуваюць сябе як у казцы. Ва ўсёй пушчы. А на сядзібе Дзеда Мароза, якую адкрылі ў 2003 годзе, лірычны настрой падтрымаюць яшчэ 12 месяцау — выявы беларусаў, якія абяцаюць выкананне вашых жаданняў. Альбо іншыя казачныя персанажы — драўляныя Беласнежка і сем гномаў, царэўна-лягушка. Пры ўсім яны сведчаць пра наша старадаўняе ўмельства ў аб'ёмнай резьбе па дрэве. А яшчэ ў садзібе — самая вялікая ў Еўропе ёлка, вышынёй у 42 метры. Ей 120 гадоў!

**— Дзеці зазвычай расказваюць Дзеду Марозу вершы. Што ж яны чытаюцъ?**

— Гасцей у мяне вельмі шмат, і не заўсёды маецца магчымасць паразмаўляць. Але чытаюць дзеткі... Чытаюць! Любяць Якуба Коласа. "Мой родны кут, як ты мне мілы..." Тым больш, што гэты куточак якраз адпавядае таму настрою лірычнаму і тым фарбам, якія ў паэме, ды цалкам — уяўленням пра Беларусь. Мы вельмі ганарымся, што прырода не абышла нас, а наадварот, адарыла незвычайнай прыгажосцю. Гэта наша візітная картка — зубр і Белавежская пушча... Чытаюць дзеці. Але што павінен сказаць: сучасныя сродкі масавай інфармацыі, тэлебачанне, інтэрнет вельмі перашкаджаюць інтэлектуальнаму развіццю. Але можа, сітуацыя хутка зменіцца. Галоўнае, што дзеткі добрыя, пішуць цікавыя пісьмы. І змест гэтых пісьмаў самы светлы, яркі. Яны так цікава пішуць пра сваіх бацькоў, жадаюць ім дабра, шчасця, столькі ў лістах падзякі. пішуць і настаўнікам, расказваюць пра сваіх сяброў.

**— У падарунк кнігі замаўляюць?**

— А як жа? Просяць. Розныя кнігі. І займальныя, і маленькія ілюстраваныя з вялікім шрыфтам. У нашых сувенірных лаўках есць шмат цікавых кніг менавіта па гісторыі Белавежскай пушчы, пра станаўленне нацыянальнага парку, пра зуброў, пра жывел. Гэта цікава!

**— Ваша нацыянальная апратка, выдатны саламяны капялюш — спецыяльна рыхтуюцца?**

— У мяне на кожную пару года спецыяльны ўбор. Гэта варыянт восеньскі, А ёсць і летні, і зімовы, і вясновы. А гэты галаўны ўбор, карона, ды і наогул уся вопратка — ад таленавітых жанчын з Мінска- Ёсць такое прадпрыемства "Скарбніца". Яны ўсе мае капрызы выконваюць.

**— А як прымаюць саламяную карону?**

— Вельмі хораша. Тым больш, што гэта эксклюзіўны варыянт. Прыязджаў сюды неяк мільянер з Японіі, дык ен праз перакладчыка так угаворваў мяне, каб я прадаў сваю карону! І вялікія грошы даваў. Але ж не прадаецца такая прыгажосць, Многія цікавяцца нашымі нацыянальнымі строямі. Нядаўна наш пасол з Фінляндыі перадала мне афіцыйнае запрашэнне наведаць іх краіну. І вельмі зацікавілася маім

адзеннем. Параіў звярнуцца ў тое самае атэлье "Скарбніца". Так што для іхняга Ёлу-Пукі можна і ў нас заказаць вопратку.

**— Дзед Мароз мае мірское імя?**

— Мае. Але гэта кандэфіцыяльная інфармацыя.

**— Як жа назваць вас чытачам "ЛіМа"?**

— Дзед Мароз!

**Источник:** ЛіМ.-2009.-24 снеж.-С.16.